# Расійскі пасол прагназуе павышэнне цаны на газ

Пытанне аб новай цане на расійскі газ для Беларусі, магчыма, будзе абмяркавана на маючай адбыцца ў жніўні сустрэчы прэм'ер-міністраў Беларусі і Расіі. Аб гэтым паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Мінску Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол РФ у Беларусі Аляксандр Сурыкаў. Паводле яго слоў, цана на расійскі газ, які пастаўляецца ў Беларусь, вызначаецца кантрактам з «Газпрамам», заключаным у 2006 годзе. І формула вызначэння цаны, прапісаная ў гэтым кантракце, роўная 80 працэнтам цаны на газ для Польшчы мінус мытныя пошліны, мінус транзіт на Польшчу праз Беларусь плюс транзіт на Беларусь. Пасол нагадаў, што ў гэтым годзе цана на газ у Польшчы складала $320, у будучым годзе гэта будзе прыкладна $400. «Плюс да гэтага далікі, звязаныя з ростам цэнаў на нафту. Яны ўдакладняцца ў першым квартале 2009 года, але гэта не будзе перавышаць 7 працэнтаў», — дадаў Аляксандр Сурыкаў. «Такім чынам, відавочна, што цана на газ перасягне за $200», — сказаў пасол.

Аляксандр Сурыкаў не выключае магчымасці вяртання да перагавораў па адзінай валюце Расіі і Беларусі. Пасол Расіі адзначыў: з улікам таго, што дысбаланс у гандлі Беларусі і Расіі павялічыўся, і ў першым паўгоддзі адмоўнае сальда для Беларусі склала $6 млрд, можна прадбачыць вяртанне размоў аб адзінай валюце.

Пагадненні аб пастаўках беларускага цукру ў Расію будуць заключацца штогод. На думку Аляксандра Сурыкава, Беларусі і Расіі мэтазгодна імкнуцца да стварэння адзіных уласнікаў-цукравытворцаў. «Тады будзе адзіны цукровы рынак», — растлумачыў ён.

Аляксандр Сурыкаў выключыў перспектыву размяшчэння на тэрыторыі Беларусі расійскіх элементаў ядзернага ўзбраення ў выпадку заключэння Польшчай пагаднення з ЗША аб размяшчэнні на сваёй тэрыторыі элементаў амерыканскай ПРА.

«Ваеннае супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў гэтым пытанні некалькі абмежавана міжнародным дагаворам 1994 года, згодна з якім Беларусь аб'яўлена бяз'ядзернай зонай, і гарантам гэтага выступіла ў тым ліку Расія», — нагадаў пасол.

Пры гэтым ён адзначыў, што размяшчэнне на тэрыторыі Беларусі іншых відаў элементаў абароны, у тым ліку ракетных комплексаў «Іскандэр» або стратэгічных бамбардзіроўшчыкаў не выключаецца. «Аб гэтым няхай дагаворваюцца ваенныя ведамствы», — дадаў дыпламат. Як падкрэсліў Аляксандр Сурыкаў, канкрэтныя дзеянні могуць быць прадуманы толькі пасля таго, як ЗША падпішуць дагавор з Польшчай.

Сітуацыя з выбарам кампаніі для будаўніцтва АЭС у Беларусі складваецца на карысць Расіі. Такую думку выказаў пасол Расіі.

**БЕЛТА.**

## СЯРЭДНЯЯ ЗАРПЛАТА БУДАЎНІКОЎ ДА КАНЦА ГОДА ПАВІННА БЫЦЬ НЕ МЕНШАЯ ЯК $1-1,2 ТЫС.

**Аб гэтым заявіў міністр архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандр Селязнёў. У першую чаргу, гэта датычыцца будаўнікоў, якія працуюць у Мінску.**

Паводле слоў Аляксандра Селязнёва, цяпер кваліфікаваныя будаўнікі зарабляюць у сярэднім $700—750 у месяц. Зарплату $1-1,2 тыс. маюць толькі асобныя брыгады вузкіх спецыялістаў...

Дэфіцыту будматэрыялаў у Беларусі няма, падкрэсліў міністр.

**БЕЛТА.**

## ТАРЫФЫ НА ПРЫГАРАДНЫЯ ПЕРАВОЗКІ ЧЫГУНАЧНЫМ ТРАНСПАРТАМ СЁЛЕТА ПАДЫМАЦЦА НЕ БУДУЦЬ

Аб гэтым паведаміў начальнік Беларускай чыгункі Уладзімір Жэрало. Ранейшым застанецца кошт білетаў і на чыгуначныя цягнікі ўнутрырэспубліканскіх зносінаў.

**«Мінск—Навіны».**

# ІНВЕСТЫЦЫЙНАЯ АДЛІГА

— Летась мы атрымалі 5,5 млрд долараў замежных інвестыцый, — паведаміў Васіль НЕКРАШЭВІЧ, галоўны эканаміст упраўлення міжнароднага інвестыцыйнага супрацоўніцтва і свабодных эканамічных зон Міністэрства эканомікі, — аднак гэта пераважна інвестыцыі кароткія, гэта значыць, непрамыя. Нам даюць грошы пад закупку, напрыклад, нафты.

Тым не менш, паводле слоў Васіля Некрашэвіча, тэмпы росту прамых інвестыцый таксама неблагія. Калі ў 2002 годзе было прыцягнута 299 млн долараў такіх сродкаў, то летась — 1,3 млрд долараў. У 2008 годзе Міністэрства эканомікі разлічвае атрымаць 2,1 млрд долараў прамых інвестыцый. У многім гэта тлумачыцца павелічэннем колькасці прадпрыемстваў з замежным капіталам — штогод іх становіцца на 500—600 больш. Наогул жа на сёння працуе прыкладна чатыры тысячы замежных і сумесных прадпрыемстваў.

Задача — больш чым сур'ёзная: стварыць у Беларусі такія ўмовы, якія дазволяць ёй трапіць у трыццатку найбольш ліберальных і зручных для вядзення бізнэсу краін свету. Аб гэтым паведаміў журналістам Яўген КАВАЛЕНКА — начальнік упраўлення прававога рэгулявання грамадзянскіх, эканамічных адносінаў, ліцэнзавання і знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства юстыцыі.

Сярод асноўных мераў у гэтым накірунку Яўген Каваленка назваў спрашчэнне адміністрацыйных працэдур у адносінах да юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, а таксама адмену інстытута «залатой акцыі». Спецыяліст заўважыў, што ў Беларусі імкнуцца стварыць такія ўмовы для дзейнасці замежных інвестараў, у якіх яны прызвычаіліся працаваць у іншых краінах.

Падатковая нагрузка ў краіне будзе паступова змяншацца. У гэтым запэўніла Ала СУНДУКОВА — начальнік галоўнага ўпраўлення міжнароднага падатковага супрацоўніцтва Міністэрства па падатках і зборах. Яна не стала хаваць, што ёсць шэраг падаткаў, у адносінах якіх плацельшчыкі выказваюць прэтэнзіі:

— У першую чаргу гэта абаротныя падаткі. Налета стаўка па іх будзе зніжана, магчыма, да аднаго працэнта, а да 2010 года яны будуць адменены. У адносінах прадастаўлення нулявой стаўкі ўскосных падаткаў мы працуем абсалютна сінхронна з усімі дзяржавамі Еўропы, дзе такія падаткі ёсць.

Сёлета завершыцца рэфармаванне Нацыянальнага інвестыцыйнага агенцтва Беларусі — аб гэтым заявіў яго дырэктар Алег ЗІНОЎЕЎ. Ён удакладніў, што за аснову былі ўзятыя прынцыпы функцыянавання турэцкага інвестыцыйнага агенцтва.

Цяпер на базе агенцтва будзе створаны сур'ёзны інфармацыйны цэнтр, дзе будуць усе звесткі аб змяненнях умоў дзейнасці замежных інвестараў на тэрыторыі Беларусі.

Пашырацца і паўнамоцтвы агенцтва, якія таксама дазволяць аператыўна вырашаць праблемныя пытанні замежных інвестараў. Ад Міжнароднага інвестыцыйнага форуму, які мае адбыцца ўвосень у Лондане, айчыннае інвестыцыйнае агенцтва чакае практычных вынікаў. Там плануецца прэзентаваць шэраг інвестыцыйных праектаў, якія рэалізуюцца ў Беларусі ў сферах прамысловасці, энергетыкі, нафтахіміі, а таксама ў банкаўскім сектары.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯЎЧЫНКА НЕ ВЯРНУЛАСЯ З ЗША З АДПАЧЫНКУ

**Міністэрства замежных спраў і пасольства Беларусі прымаюць меры па найхутчэйшым вяртанні з ЗША няпоўнагадовай грамадзянкі нашай краіны.**

Як паведамілі **БЕЛТА** ў Дэпартаменце па гуманітарнай дзейнасці Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Беларусі, 5 жніўня група беларускіх дзяцей у складзе 25 чалавек, якая знаходзілася на аздараўленні ў ЗША, планавала вылецець у Мінск з Сан-Францыска. Да назначанага часу ў аэрапорт не прыбыла адна няпоўнагадовая грамадзянка Беларусі. У сувязі з гэтым вылет групы беларускіх дзяцей быў адкладзены. «Вечарам гэтага ж дня і раніцай 6 жніўня ў МЗС Беларусі быў выкліканы Часовы Паверана ў справах ЗША ў Рэспубліцы Беларусь Джонатан Мур. Амерыканскаму дыпламату было перададзена патрабаванне беларускага боку прыняць усе неабходныя меры для забеспячэння безумоўнага вяртання беларускай грамадзянкі на радзіму», — расказалі ў дэпартаменце.

Амерыканскаму боку была ўручана адпаведная нота і заяўлена патрабаванне забяспечыць неадкладны вылет групы беларускіх дзяцей на радзіму ў поўным складзе.

# Беларусь расчыняе дзверы турыстам




**Кампанія Etihad Airways стала першай авіялініяй, якая аб'яднала краіны Персідскага заліва і Беларусь.**

Рашэнне аб адкрыцці рэйса Мінск—Абу-Дабі—Мінск было прынятае яшчэ ў 2007 годзе ў ходзе перамоў паміж Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам і Прэзідэнтам ААЭ шэйхам Халіфам бэн Заідам Аль Нахаянам. З 5 жніўня два разы на тыдзень — у аўторак і чацвер — можна паляцець у Мінск і назад, у Абі-Дабі. У кастрычніку дабавіцца яшчэ адзін, трэці рэйс.

— Цікавасць да гэтага рэйса, безумоўна, будзе, — пракаментаваў падзею віцэ-прэзідэнт па продажах і абслугоўванні авіякампаніі Etihad Airways Гірт Бовен. — Напрыклад, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты ў мінулым годзе ў якасці турыстаў наведала каля 8 тысяч беларусаў. З адкрыццём новага прамога рэйса можна чакаць, што пасажырапаток павялічыцца да 10 тысяч чалавек у год.

Як адзначыў намеснік міністра спорту і турызму Беларусі Чэслаў Шульга, за апошнія два тыдні амаль усе асноўныя турыстычныя аператары нашай краіны заявілі аб жаданні прапанаваць свае паслугі ў адкрыцці новых тураў у краіны Персідскага заліва.

**Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.**

## Абзац

■ Урад Беларусі ўзмацніў патрабаванні да рэалізацыі прадукцыі, якая змяшчае генетычна мадыфікаваныя кампаненты, і ўнёс адпаведныя змяненні ў правілы рознічнага гандлю імі. Інфармацыя аб наяўнасці такіх кампанентаў у прадуктах харчавання цяпер будзе размяшчацца на цэнніках. Рашэнне аб гэтым змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў ад 4 жніўня № 1115.

■ **Еўракамісія падрыхтавала праект рэформы рынку тытунёвых вырабаў, паводле якога праз тры гады на тэрыторыі Еўрасаюза будуць прадавацца толькі «самазатухальныя» цыгарэты. Такія цыгарэты будуць дадаткова пакрытыя падвойным напыленнем з цэлюлозы і альгінату, якія, праз некаторы час пасля таго, як курэц перастае зацягвацца, перакрываюць доступ кіслароду і тушаць агонь. Дадатковае пакрыццё бяспечнае для здароўя і ніяк не ўплывае на смак цыгарэт.**

■ Мінсельгасхарч Беларусі 5 жніўня ўвёў забарону на ўвоз прадукцыі жывёлагадоўлі і кармавых дабавак для свінагадоўлі з Паўднёвай Асецыі і Арэнбургскай вобласці РФ, дзе выяўлены ачагі афрыканскай чумы свіней. Афрыканская свіная чума пагражае стаць куды больш сур'ёзнай небяспекай, чым сумна вядомы птушыны грып. Ад гэтай смяротнай хваробы загінулі ўжо паўтары тысячы жывёл. Эксперты не выключаюць, што хуткім часам ачагом размнажэння стане ўся краіна — а ніякага эфектыўнага сродку ад гэтай хваробы няма. Афрыканская чума пераносіцца людзьмі і кабанамі, распаўсюджваецца праз корм, пашу, транспарт. Кубанскія ўлады вырашаюць пытанне аб афрыканскай чуме радыкальна: яны ўжо звярнуліся да мясцовага насельніцтва з прапановай у тэрміновым парадку самім забіць усіх наяўных свіней і адразу ж спажыць іх у ежу. Яшчэ больш сур'ёзную пагрозу ўяўляе перспектыва мутацыі віруса: у такім разе не выключана, што ў зоне рызыкі апынуцца не толькі жывёлы, але і людзі.

■ **У сталіцы Саудаўскай Аравіі ўступіў у сілу закон, паводле якога ў Эр-Рыядзе забаронена прадаваць кошак і сабак у якасці хатніх гадаванцаў, а таксама гуляць з імі па вуліцах. Па меркаванні рэлігійнай паліцыі, наяўнасць гадаванца ва ўладальніка часта служыць для прыцягнення ўвагі процілеглага полу.**

■ У Нью-Ёрку дванаццацігадовая дзяўчынка звалілася з 14-га паверха і, прызямліўшыся на кучу сажы, засталася жывой і цэлай. У выніку падзення Грэйс Берджэр толькі атрымала траўму сцягна. Інцыдэнт адбыўся на Манхэтэне. Каб паказаць сваёй стрыечнай сястры від на Гудзон і Манхэтэн, Грэйс забралася на дах свайго дома. Спатыкнуўшыся, дзяўчынка правалілася ў цагляны комін і, праляцеўшы 55 метраў, звалілася ў кучу попелу глыбінёй у паўметра.

## Поўны абзац



■ **Маладыя з Вялікабрытаніі абвянчаліся ў паветры, прывязаныя да крылаў невялікіх самалётаў на вышыні 152 метры. Тры біпланы ляцелі з хуткасцю 161 км у гадзіну. Клятвы кахання і вернасці маладыя гаварылі ў спецыяльныя мікрафоны — так што ўсю цырымонію маглі чуць госці.**

■ Адвакаты Роберта Куўі, прысуджанага ў штаце Агаё да смяротнага пакарання за згвалтаванне і забойства двух маладых жанчын у 1986 годзе, падалі іск у федэральны суд з просьбай адкласці выкананне прысуду з-за таго, што іх падабаронны пакутуе на атлусценне. Зараз пакаранне смерцю праз увядзенне ін'екцыі — адзіны спосаб умярцвення злачынцаў, які прымяняецца ў штаце. Сам Куўі сцвярджае, што ён занадта поўны для таго, каб быць пакараным: выканаўцам будзе цяжка знайсці яго вены, а яго залішняя вага зробіць уведзеныя прэпараты неэфектыўнымі. Пры росце каля 168 сантыметраў злачынец важыць больш за 120 кілаграмаў.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ДА НАЙБУЙНЕЙШАГА Ў ГІСТОРЫІ КРАДЗЯЖУ ІНФАРМАЦЫІ Ў ЗША МАЕ ДАЧЫНЕННЕ БЕЛАРУС?

**Міністэрства юстыцыі ЗША ў аўторак заявіла аб тым, што 11 чалавек, у тым ліку інфарматар сакрэтнай службы ЗША, абвінавачваюцца па справе аб узломе базы дадзеных дзевяці найбуйнейшых гандлёвых прадпрыемстваў Штатаў і продажы больш чым 41 мільёна нумароў крэдытных і аплатных картак. Ашуканцы абвінавачваюцца ў тайнай змове, узломе камп'ютараў, падробцы і крадзяжы асабістых дадзеных. Трое з абвінавачаных — грамадзяне ЗША, адзін з Латвіі, трое з Украіны, двое з Кітая і адзін з Беларусі.**

Махляры ўзламалі сеткі гандлёвых прадпрыемстваў, банкаў і атэляў і ўстанавілі праграмы-шпіёны, якія адсочвалі нумары картак, паролі і інфармацыю аб рахунках. У выніку злачыннай дзейнасці хакераў гандлёвыя прадпрыемствы і фізічныя асобы панеслі велізарныя страты, «памер якіх немагчыма вызначыць». Улады заяўляюць, што яны дагэтуль не валодаюць дакладнай інфармацыяй аб колькасці ахвяраў фінансавых махінацый. Многія з іх могуць быць у недасведчанасці, што іх асабістыя файлы былі выкрадзеныя.

Выкрадзеная інфармацыя захоўвалася на двух эстонскіх і ўкраінскіх серверах. Злачынная група дзейнічала не толькі ў ЗША, але і ў краінах Еўропы, у Кітаі і Тайландзе.

Аб справе было абвешчана на прэс-канферэнцыі ў Бостане з удзелам міністра юстыцыі ЗША Майкла Мукейсі. Кожны з хакераў можа сесці ў турму пажыццёва.

### ВАЕННЫ ПЕРАВАРОТ У МАЎРЫТАНІІ: ЗАТРЫМАНЫЯ ПРЭЗІДЭНТ, ПРЭМ'ЕР І КІРАЎНІК МУС

**У Маўрытаніі адбыўся ваенны пераварот, прэзідэнт, прэм'ер і міністр унутраных спраў затрыманыя, паведамляе катарскі тэлеканал Al Jazeera.**



Прэзідэнт Маўрытаніі Сідзі Шэйх Мухамед Абдалахі, прэм'ер-міністр Ях'я Вагф і кіраўнік МУС сталі заложнікамі апальных генералаў — кіраўнікоў Генштаба і прэзідэнцкай гвардыі, адпраўленых кіраўніком дзяржавы ў адстаўку.

Учора вайсковыя падраздзяленні акружылі будынак нацыянальнага тэлебачання ў сталіцы краіны Нуакшоце. Тэле- і радыёвяшчанне цалкам спынена. Салдаты кантралююць шэраг дзяржустаноў, у тым ліку прэзідэнцкі палац.

У той жа час, як заявіў у эфіры тэлеканала Al Jazeera афіцыйны прадстаўнік прэзідэнцкай канцылярыі, «прэзідэнт не перавысіў сваіх паўнамоцтваў, звольніўшы ваенных камандзіраў». Паводле яго слоў, «тое, што адбылося, з'яўляецца ваенным пераваротам, які здзейснілі путчысты».

Мяркуючы па відэасюжэтах з Нуакшота, у сталіцы ўчора захоўвалася адносна спакойнае становішча. Прынамсі, ніхто не страляў. Многія ў краіне падтрымалі пераварот.

### «БРОНЗАВЫ САЛДАТ» МОЖА ВЯРНУЦЦА Ў ЦЭНТР ТАЛІНА ПА ВОЛІ СТРАСБУРГА

**Адвакат Міхаіл Йофе мае намер накіраваць у Еўрапейскі суд па правах чалавека іск супраць урада Эстоніі, які паўтара года таму прыняў рашэнне перанесці манумент Воіну-вызваліцелю з цэнтра Таліна.**

Йофе вядомы па справе былога партызана Васіля Кононава, які адсудзіў у Страсбургу 30 тысяч еўра ва ўладаў Латвіі за абвінаваўчы прысуд, вынесены яму ў 2000 годзе. Зараз Йофе, які абараняе інтарэсы сваякоў тых салдатаў, што былі пахаваныя на Тынісмягі, разлічвае, што калі справа будзе выйграна, то эстонскім уладам прыйдзецца вярнуць помнік «бронзаваму салдату» ў цэнтр Таліна. Паводле слоў адваката, такое развіццё падзей рэальнае. Ён уважліва вывучыў усе дакументы і прыйшоў да высновы, што ўлады Эстоніі парушылі міжнароднае права.

## Глыбінка



**Асфальт пераходзіць у гравійку, а ў сваю чаргу тая — у прасёлачную дарогу. Яшчэ колькі хвілін — і заўважаеш, што раптам «знікае» нібыта ўжо ўсюдыісны «Велком». Нарэшце недзе праз кіламетр за невялікай вёсачкай Дульскія амаль што сярод лесу з'яўляецца велізарны драўляны дом у атачэнні саду і няхітрых гаспадарчых пабудоў. Гэта Кучняры — адзін з больш чым сотні хутароў Міёрскага краю.**

# ХУТАРАНЕ

### «Жонка — нітка, муж — іголка»

— Я сам адсюль, з гэтых мясцін, тут скончыў школу і адсюль пайшоў служыць у армію, — тлумачыць Іван Пірог, цяперашні гаспадар Кучняроў. — Здаецца, у мяне было ўсё, ездзіў «па рамантыку» ў Сібір, працаваў на заводзе і на будоўлі ў Полацку, ажаніўся. Але ўсё роўна цягнула сюды. Апроч таго, тут заставалася жыць мая бабуля, а ёй трэба было дапамагаць.

Прыкладаў, калі сем'і перабіраюцца з вёскі ў горад, — безліч. Нашмат радзей сустракаюцца выпадкі руху ў адваротным накірунку, з горада ў вёску. Тут жа сітуацыя аказалася па-сапраўднаму неардынарнай. Маладыя людзі падаюцца ад «усіх выгод»... на хутар. У той час, у сярэдзіне 1990-х, Івану яшчэ не было і трыццаці гадоў. Яго ж жонцы Таццяне ледзьве споўнілася дваццаць два...

— Сказаць, што мае бацькі былі супраць — не сказаць нічога, — працягвае Таццяна. — Бацькі самі нарадзіліся ў вёсцы, іх дзяцінства прыйшлося на складаны пасляваенны час, таму яны імкнуліся вучыцца, паступіць з адной толькі мэтай — жыць у горадзе, дзе ўсё было лёгка. Пэўна, адсюль і неразуменне, маўляў, што будзеш рабіць там ты, гараджанка? Аднак рашэнне пакінуць Полацк было прынятае. Бо нездарма людзі кажуць: жонка нітка, муж іголка, куды муж — туды і жонка.

Цяпер бацькі ўжо не наракаюць. Іван і Таццяна дапамагаюць прадуктамі — пражыць «з рынку» на пенсію ў горадзе нялёгка. Да таго ж сумаваць бабулі і дзядулю не дае ўнук. Падчас навучальнага года ён жыве ў Полацку — інакш прыйшлося б хадзіць з Кучняроў у школу амаль за дзесяць кіламетраў.

Словам, усё нібыта наладзілася. Аднак спачатку насамрэч было цяжка. Прыстасавацца да хутара дапамагаў Іван, ён навучыў і касіць, і карову даіць, і печку паліць, і нават збіраць адразу дзвюма рукамі ягады. Атрымлівалася не ўсё і не адразу, і ўсё ж — справілася. Патрапіла нават «вынайсці» ўласны рэцэпт чаю — сумесь з лісця маліны, суніц, парэчак і вішні. Напой атрымліваецца цёмным і адначасова — надзвычай смачным...

А што да змены ладу жыцця, то Таццяна заўважае: паўсюль ёсць свае нюансы, штосьці сапраўды прасцей у горадзе, але штосьці — на хутары.

— Мы самі сабе гаспадары, і ведаеце, ужо ад гэтага адчування неяк дыхаецца лягчэй, — кажа Таццяна. — Маем два гектары зямлі, пашу і сенажаць, трымаем карову, каня, пчол, шмат авечак, так што работы хапае. Звычайна прачынаюся ў 5 гадзін ранку, а кладуся спаць апоўначы. Ведаеце, глядзець па тэлевізары тыя ж серыялы няма ні часу, ні, калі шчыра, жадання. Дапамагае ж адно — мы прызвычаіліся працаваць разам, удваіх і пры гэтым ні на кога не спадзявацца. Так, іншым разам да нас прыязджаюць госці, прапануюць штосьці зрабіць, але часцяком даводзіцца адмаўляць: нават грабель і вілаў у нас толькі двое.

### «Лепш пацярпець, чым мець даўгі»

Іван працуе егерам, а Таццяна — сацыяльным работнікам. Грошы маюць невялікія. Зрэшты, некалі было па-іншаму. Сям'я не працавала ўвогуле — жылі толькі з падворку.

— У свой час спрабавалі прадаваць бульбу, але зараз збольшага вырошчваем яе і іншую гародніну для сябе, — распавядае Таццяна. — Не надта атрымліваецца і з авечкамі. Наконт мяса пытанняў няма, а вось з шэрсцю і са скурамі — праблема. Скуру можна здаць за некалькі тысяч рублёў, прычым да гэтага яе трэба вычысціць, вымыць, сабраць даведкі, адвезці ў горад. Таму і атрымліваецца — выдаткі могуць перавысіць прыбытак.

Затое дапамагае малако. Яго носяць да здатчыкаў за кіламетр у бліжэйшую вёску. Занятак няпросты, але выгадны. Штомесяц малако «прыносіць» каля 450 тысяч рублёў — гэта нашмат больш, чым тая ж зарплата Таццяны.

— Трэба і сыну дапамагчы, і ў хату сёе-тое купіць, аднак у асноўным даходы ідуць на дом, — заўважае Іван. — Адразу пасля пераезду на хутар мы жылі ў бабулі, свой дом пачалі будаваць толькі гадоў дзесяць таму, і ўсё ідзе не так хутка, як хацелася б. Тым не менш рабіць яго трэба, а разлічваць тут выпадае толькі на сябе. Так, неаднаразова прапаноўвалі ўзяць крэдыт, аднак гэта — не наша. Лепш ужо пацярпець, чым мець даўгі, я ўвогуле больш за ўсё на свеце не люблю аднаго: быць некаму вінаватым.

### Замок — непатрэбная рэч

Пытанне аб намерах перабрацца ў буйную вёску выклікае толькі ўсмешку — навошта? Ёсць гаспадарка, электрычнасць, тэлефон, зноў-такі ў суседнюю вёску прыходзіць аўталаўка. І ўсё ж галоўная разынка Кучняроў — прырода. Адразу за хутарам пачынаецца цнатлівы лес і вялікае балота. А гэта і журавіны з чарніцамі, і грыбы, і рыбалка. Дарэчы, пасядзець з вудай зусім не супраць як Іван, так і Таццяна. Дзеля справядлівасці, робяць яны гэта пераважна зімой — знайсці некалькі вольных гадзін улетку амаль нерэальна. Магчыма, менавіта таму перад домам з'явілася сажалка. У сажалку запусцілі карасёў.

— У нас можна сустрэць ваўка, літаральна да дома падыходзяць дзікі, якім чамусьці вельмі падабаецца «ўзворваць» сенажаць, — распавядае Іван. — Ці варта іх баяцца? Наўрад ці, бо, на жаль, часцяком нашмат страшнейшыя людзі. У тым жа горадзе толькі паглядзеў не так — ужо могуць быць непрыемнасці. А на хутары нават няма патрэбы зачыняць дзверы, дзе рэч пакладзеш — там яе і возьмеш.

...Дарабіць дом, вывучыць сына, крыху павялічыць гаспадарку за кошт індыкоў — вось, напэўна, і ўсё. Будаваць асаблівыя планы не перспектыву Іван і Таццяна не хочуць. Дакладна адно: хутар, у які ўкладзена шмат працы, яны ўжо не кінуць. А надалей — «як ляжа карта»...

### Птушкі і гнёзды

Калі ў Беларусі з'явіліся першыя аднаасобныя гаспадаркі, зараз ужо не скажа ніхто. Вядома толькі, што ў пачатку XIX стагоддзя на нашых землях пачала імкліва павялічвацца колькасць шляхецкіх фальваркаў, а з канца таго ж стагоддзя — і хутарскіх пасяленняў сялян. Гісторыкі сцвярджаюць, што сто гадоў таму ў адной Віцебскай губерні налічвалася больш за 5 тысяч хутароў, прычым перасяленні наводдаль ад вёсак сталіся па-сапраўднаму масавай з'явай. Гэтаму «дапамагала» як дзяржаўная падтрымка падчас вядомай сталыпінскай аграрнай рэформы, так і перакананне, што жыць і працаваць лепш самастойна. Хутар стаўся своеасаблівым сінонімам багацця.

Цікава, што «рэжым найбольшага спрыяння» працягваўся і першым часам пасля ўсталявання савецкай улады, «аднаасобнікі» нават плацілі меншыя падаткі. Аднак неўзабаве меркаванне змянілася: хутары пачалі лічыць галоўнай пагрозай... калгасам. Пік перасялення ў буйныя пасёлкі ва Усходняй Беларусі прыпаў на 1930-я гады, а ў 1950-х тое ж адбывалася і ў заходняй частцы краіны. Вёска насамрэч падавалася больш прывабнай. Але туды паехалі далёка не ўсе.

— Яшчэ ў 1970—80-х гадах, калі на нашых землях праводзілася вялікая меліярацыя, уласнікам адзінокіх дамоў прапаноўвалася някепская кампенсацыя, — узгадвае старшыня Міёрскага райсавета Раіса Парфёненка. — Кожны, хто хацеў, мог з'ехаць куды заўгодна, і хтосьці такой магчымасцю скарыстаўся. Але многія аб пераездзе не хацелі нават размаўляць. Людзі трымаліся за свой звыклы лад, і асабліва — старэйшае пакаленне. Праўда, з цягам часу ахвотных заставацца тут застаецца ўсё менш.

Калі ў 2006 годзе на Міёршчыне налічвалася 482 населеныя пункты, то летась 470, а сёлета — 460. Не сакрэт, што пераважна здымаюцца з уліку менавіта хутары. Гэта, зрэшты, і не дзіўна: большасць іх жыхароў ужо мае пенсійны ўзрост. Нібыта стала менш праблем з аўталаўкамі, прыйшла электрычнасць, стала больш прыватных «легкавікоў», аднак нягледзячы ні на што моладзь перш-наперш цікавяць гарады ці аграгарадкі. І якія-небудзь папрокі тут проста недарэчы.

— Зразумела, нехта выбірае адасобленае жыццё свядома, але такіх людзей усё ж няшмат, — заўважае Раіса Парфёненка. — Колькасць хутароў змяншаецца, а адной з найбольш складаных праблем раёна становіцца знос пустых і нікому не патрэбных дамоў. Вось толькі ці знікнуць адзінокія паселішчы назусім — яшчэ пытанне. Частка з іх застанецца, але, хутчэй за ўсё, ужо ў іншых ролях: або фермерскіх гаспадарак, або...месцаў для адпачынку. Прынамсі, прыклады, калі хутары купляюць на дачы, ёсць. Прычым апошнім часам часцей за ўсё робяць гэта не міёрцы, а жыхары буйных гарадоў.

**Сяргей ГРЫБ, фота аўтара.**
*Міёрскі раён.*

### АВАРЫЯ — ТРОЕ ЗАГІНУЛЫХ

У Аршанскім раёне на аўтадарозе Брэст — Мінск — мяжа Расіі загінулі тры чалавекі. 40-гадовы вадзіцель-экспедытар, кіруючы аўтамабілем «Мерседэс-Бенц», выехаў на паласу сустрэчнага руху і ўрэзаўся ў «Мазду-626». Вадзіцель «Мазды» і яго пасажыры — 26-гадовая жонка і 2-гадовая дачка — загінулі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### З пакостам — ды на мужыка

А чаму раней не звяртаўся да нас — такое пытанне задалі ў Мазырскім гаррайаддзеле ўнутраных спраў мужчыну 1949 года нараджэння, які звярнуўся туды толькі праз два месяцы пасля таго, як, паводле яго слоў, яго хацела пазбавіць жыцця адна маладзіца. Было над чым падумаць, толькі і адказаў той... Каля дачнага дома аднаго садова-агароднага таварыства жанчына абліла яго пакостам і пагражала чыркнуць запалкай, каб ён успыхнуў, нібы факел. Як устаноўлена, жанчына тая на дзесяць гадоў маладзейшая за мужыка, нідзе не працуе. А што было паміж імі, чаму такое здарылася, застаецца пакуль тайнай.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### ХТО НАЕХАЎ?

На тэрыторыі Баранавіцкай птушкафабрыкі пад заднім колам трактара Т-25 знайшлі труп 31-гадовага газаэлектразваршчыка, які працаваў на гэтым прадпрыемстве. Хто на яго наехаў, невядома.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### ЮНЫ МАТАЦЫКЛІСТ ЗАГІНУЎ

У Браслаўскім раёне вучань 8-га класа Слабадской сярэдняй школы, не маючы правоў кіроўцы, ехаў на матацыкле і вёз пасажыраў — вучняў 2 і 5 класаў. Ён не ўступіў дарогу ЗІЛу. Юны матацыкліст загінуў, а ягоныя пасажыры шпіталізаваныя.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### БЕНЗАПІЛОЙ — ПА КУРАХ І ПЕЎНЯХ?

Нядоўга давялося суседзям жыхаркі вёскі Сырад Калінкавіцкага раёна адначасова і спачуваць, і жартаваць з прычыны таго, што ў яе ноччу нехта ўкраў з хлява 22 (!) курыцы і... бензапілу. Маўляў, тая піла зладзею спатрэбілася, відаць, каб з птушынага царства рабіць фарш. Ахвотніцай дыетычнага мяса аказалася равесніца пацярпелай, якая нідзе не працуе і раней ужо была асуджана за крадзеж.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

УП «Минский городской центр недвижимости»
ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже помещения транспортного назначения – гаража № 293, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Ангарская, 100 в массиве «Северный» (общая площадь — 20,6 кв. м, инвентарный номер 500/D-509444).
Начальная цена – 15 279 390 белорусских рублей.
К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:
заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.
Задаток в размере 1 500 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.
Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.
Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. **Аукцион состоится 22 августа 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.** Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 20 августа 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.
Телефоны для справок: (017) 227 48 36, 227 40 22.
УНП 190398583

УП «Минский городской центр недвижимости»
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже изолированного помещения – гаража № 242 в гаражном массиве «Зеленый Луг» по адресу: г. Минск, пер. Кольцова А.В, 1-ый, д. 29 (кирпичный гараж со смотровой ямой общей площадью 16,9 кв. м, инв. № 500/D-63394).
Начальная цена – 15 549 000 белорусских рублей.
К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:
заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.
Задаток в размере 1 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.
Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.
Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. **Аукцион состоится 22 августа 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.** Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 20 августа 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.
Телефоны для справок: (017) 227 48 36, 227 40 22.
УНП 190398583

Усяжский сельский исполнительный комитет Смолевичского района (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»
ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в д.Узбережье, в том числе:

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Начальная цена |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Смолевичский район, д.Узбережье | 624885606101000003 | 0,2000 га | 421 740 руб. |
| 2 | Смолевичский район, д.Узбережье | 624885606101000005 | 0,1998 га | 421 318 руб. |
| 3 | Смолевичский район, д.Узбережье | 624885606101000004 | 0,2000 га | 421 740 руб. |
| 4 | Смолевичский район, д.Узбережье | 624885606101000006 | 0,1997 га | 421 107 руб. |
| 5 | Смолевичский район, д.Узбережье | 624885606101000007 | 0,1997 га | 421 107 руб. |

Задаток в сумме 42 000 рублей перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». В непосредственной близости имеются сети электроснабжения. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы в сумме 605 254 рубля, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона (по каждому лоту). Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 09.09.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 08.09.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.
Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.
УНП 690324015

Государственное удостоверение на право охоты № 146992 на имя **РУДКЕВИЧА Михаила Ивановича считать недействительным.**

Асабістае

# СВАЯ зямля, альбо як стаць дробным землеўладальнікам

**Зямлю пры дачы, якая знаходзіцца ў вёсцы, я вырашыў аформіць у прыватную ўласнасць — захацеў стаць гаспадаром на ёй, каб мае нашчадкі валодалі ёю, і каб ніхто не мог на тую зямлю ступіць без майго дазволу, і каб...**

Прайшло ўжо паўтара месяца, як дакументы на мае 19 сотак Крошынскі сельсавет адправіў у Брэст. На фоне таго, што ўсе адказы ў нас даюцца на працягу месяца, я вырашыў праясніць сітуацыю.

Зазірнуў у раённы аддзел землеўпарадкавання, пагаварыў там са спецыялістамі, выйшаў на аналагічную структуру ў абласным цэнтры, а затым пачаў наводзіць даведкі ў праектным інстытуце «Брэстгіпразем». Менавіта гэтая ўстанова і займаецца афармленнем дакументаў.

Дырэктар інстытута Уладзімір Свабода растлумачыў, што напружаная сітуацыя склалася з-за таго, што на сёння 6 тысяч чалавек жадаюць атрымаць дакументы і гэта паламала ўсе графікі, хоць людзі працуюць і ў выхадныя. Але праз нейкі год сітуацыя нармалізуецца, і ўжо не будзе такога ажыятажу.



Мяне ж цікавіў не толькі тэрмін выканання заказу, але і тое, што ўчастак яшчэ раз павінны перамяраць. У мяне ёсць дакументы, выдадзеныя БТІ (план участка з домам), ёсць рашэнне сельсавета, што зямля такім жа памерам перадаецца мне ў прыватную ўласнасць і за тыя 19 сотак я заплаціў грошы. Здавалася б, навошта прысылаць яшчэ людзей — зямля ж не гумавая? Можа, тут нейкая бюракратычная закавыка? Напрыклад, узяць дадаткова з чалавека грошы.

З размовы з рознымі спецыялістамі стала ясна, што часта ўзнікаюць канфліктныя сітуацыі літаральна з-за нейкіх сантыметраў, і чалавек патрабуе, каб усё было зафіксавана на паперы. Бывае, сустракаюцца накладкі, якіх раней не прымячалі. Памерлі бацькі, і вось дзеці пачынаюць дзяліць маёмасць і ўчастак. Здавалася б, усё вымерана, а тут ніхто з дзяцей пядзі зямлі не хоча ўступаць, і занава даводзіцца межы пракладваць.

У нашых вёсках яшчэ шмат хто не мае на маёмасць ніякіх дакументаў. Жылі ў гэтай хаце бацькі, а цяпер і дзеці дажываюць век.

— Калі некаму трэба будзе, то няхай робяць тыя паперы, — адмахваюцца гаспадары. І пенсіянераў рабіць дакументы не прымусіш.

А ў гэтым парадак павінен быць.

У краінах, дзе існуе спрадвечная ўласнасць, усё прасцей. Дакументы на той жа дом могуць захоўвацца не адно стагоддзе, а ў нас толькі робяцца першыя крокі, каб у чалавека з'явіўся афіцыйны дакумент.

Мы яшчэ не разумеем важнасць гэтага кроку, бо практычна не мелі права на зямлю. І стварылася абсурдная сітуацыя. Дом мой, а стаіць не на маёй зямлі. І некалі тыя соткі маглі абрэзаць па самы парог. Такое даводзілася бачыць. Чалавек не хацеў уступаць у калгас, то калгаснае жыта расло ў яго пад самымі вокнамі.

Няхай сёння ў прыватную ўласнасць можна аформіць толькі 25 сотак, але гэта ўсё ж прарыў. Калі ж у кагосьці пры хаце, напрыклад, 45 сотак, то як тут быць? Астатнія 20 сотак бяруцца ў арэнду, і гэта будзе зафіксавана афіцыйна.

**А вось якія мне давялося прынесці дакументы ў сельсавет на афармленне ўчастка ў прыватную ўласнасць, каб іх адправілі ў абласны цэнтр:**

- **дагавор куплі-продажу дома,**
- **тэхнічны пашпарт на жылы дом з рэгістрацыйным пасведчаннем і планам зямельнага ўчастка,**
- **рашэнне сельсавета аб перадачы зямлі ў прыватную ўласнасць,**
- **квіток аплаты за прыватызацыю зямлі,**
- **ксеракопія пашпарта (старонка са здымкам і старонка з прапіскай).**

Наконт аплаты, то ў кожнай мясцовасці зямля мае свой кошт. Напрыклад, у вёсцы, дзе мая дача, за 1 сотку зямлі неабходна заплаціць 4 долары (у беларускіх рублях). Маецца на ўвазе тая зямля, якая перадаецца ў прыватную ўласнасць, арэнда ж мае іншую цану.

А далей сітуацыя развіваецца такім чынам (ва ўсякім разе на Брэстчыне): сельсавет дакументы адпраўляе ў праектны інстытут, там іх рэгіструюць, разглядаюць, прысылаюць гаспадару дагавор, у якім сказана, колькі неабходна заплаціць і ў які тэрмін. Аплата залежыць ад складанасці з падрыхтоўкай дакументаў і хістаецца ў межах 105—262 тыс. рублёў. Затым на працягу 43 дзён дакументы будуць зробленыя і адпраўленыя ў райвыканкам на зацвярджэнне. Іх яшчэ неабходна будзе зарэгістраваць у БТІ і заплаціць за гэта грошы.

Як бачым, працэс афармлення даволі доўгі, але гэта звязана найперш з тым, што масава пачалі падаваць дакументы тыя, хто мае дачы ў садовых кааператывах.

Я прыйшоў да высновы, што мой участак прыедуць абмяраць, магчыма, зімой, і захваляваўся, каб не прыйшлося мне для землямераў расчышчаць гурбы. Але праз нейкі тыдзень мне даслалі квіток на аплату, а неўзабаве прыехалі і землямеры. Такая аператыўнасць толькі парадавала.

Калі я ўсё ж атрымаю дакументы на свае соткі і стану сапраўдным уласнікам зямлі, то з усіх бакоў павешу шыльдачкі: «Увага! Прыватная ўласнасць — ахоўваецца законам!» Мая зямля, мая... Цікава, а калі я напішу завяшчанне, каб мяне пахавалі ў канцы майго ўчастка, сярод ядлоўцу і соснаў, — што будзе? Хацелася б зліцца са сваёй зямлёй назаўсёды!

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# Свае сокі і каньяк

**Айчынная перапрацоўчая прамысловасць пераходзіць у апошнія гады на якасна новыя метады работы. Дарэчы, у Беларусі зараз — звыш 120 перапрацоўчых прадпрыемстваў розных формаў уласнасці, акрамя таго, толькі кандытарскіх заводаў — 168.**

Паводле слоў начальніка ўпраўлення навукова-тэхнічнага развіцця, капітальнага будаўніцтва і інвестыцый Беларускага дзяржаўнага канцэрна харчовай прамысловасці «Белдзяржхарчпрам» Ігара ШУСТАВА, тыя ж спіртавая і кансервавая галіны ўжо даўно цалкам вычарпалі свае магчымасці. Дастаткова сказаць, што адпаведныя заводы ўзводзіліся па краіне ў 50—60-я гады. На сёння алкагольная, кансервавая, цукровая вытворчасці перажылі сур'ёзнае тэхнічнае пераўзбраенне. У выніку гэтага алкагольная галіна цалкам пазбавіцца пладова-мацаваных вінаў, на змену якім павінны прыйсці віны фруктовыя, у тым ліку і вінаградныя, прычым высокай якасці. У Брэсцкай і Гродзенскай абласцях ужо з'явіліся нават першыя вінаграднікі, што стала магчымым у першую чаргу дзякуючы павышэнню сярэднегадавой тэмпературы паветра ў Беларусі. Амбіцыйныя планы нашых вытворцаў дазваляюць меркаваць, што не за гарамі і той час, калі беларусы паспытаюць і свой каньяк. Дарэчы, што датычыць больш спакойных напояў, то ў рэспубліцы ўзведзена і восем аб'ектаў, магутнасць якіх у хуткім часе дазволіць цалкам забяспечыць краіну сокамі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Больш пены!



# ПА ПІЎКУ!

**Любімае многімі піва гатавалі яшчэ ў старажытныя часы — у Вавілоне, Егіпце, Кітаі, Арменіі. У сярэднія вякі піва выраблялася ў асноўным ў паўночных рэгіёнах, дзе дрэнна рос вінаград. У той час піва мела нізкі статус і лічылася напоем беднякоў. Зараз найбуйнейшымі піўнымі вытворцамі з'яўляюцца Кітай, ЗША, Германія, Расія і Бразілія. Праўда, недасягальным лідарам у спажыванні піва з'яўляецца Чэхія —161 л на душу насельніцтва ў год.**

Піва вырабляюць на аснове соладу — прарошчаных зярнят злакаў, звычайна ячменю. Солад сушаць пры тэмпературы каля 85 градусаў, пасля чаго адбіваюць адрослыя карэньчыкі, каб будучае піва не было гаркавым, аддзяляюць шалупінне, і ў такім выглядзе захоўваюць прыкладна месяц, дзякуючы чаму напой не будзе мутным.

Здробнены солад змешваюць з вадой і вараць — гэта і ёсць сусла. Далей у сусла дадаюць суквецце хмелю, у якім утрымліваецца хмелевая смала, што надае піву характэрную гаркавасць. Пасля варкі сусла ахалоджваюць і прымушаюць брадзіць, пасля чаго адпраўляюць даспяваць у закрытых чанах пад ціскам вуглекіслага газу пры тэмпературы 0—2 градусы. Тут піва набывае водар, колер і празрыстасць. Дрожджавыя клеткі і бялок апускаюцца на дно, дзякуючы чаму піва і становіцца празрыстым. Пасля адбываецца заключны працэс — фільтрацыя, калі ўвесь асадак выдаляецца.

Шчыльнасць піва, якая ўказана на этыкетцы, абазначае суадносіны першапачатковага ўтрымання сухіх рэчываў і вады. Гэта колькасць соладу, рысу (калі яго дадаюць) у адзінцы аб'ёму. Чым меншая шчыльнасць піва, тым менш спатрэбілася прадуктаў для яго вырабу, а таму яно будзе таннейшым. Напрыклад, старое добрае «Жыгулёўскае» наогул не ўтрымлівае цукру і іншых дабавак у адрозненне ад больш дарагіх відаў гэтага напою.

У ЗША і Еўропе піва класіфікуюць паводле спосабу браджэння. **Эль** — піва, якое збраджваюць пры адносна высокай тэмпературы (15—20 градусаў) з дабаўленнем дражджэй верхавога браджэння. Яно адрозніваецца садавінным прысмакам і павышанай колькасцю спірту. **Лагер** збраджваецца пры нізкай тэмпературы (5—15 градусаў) з выкарыстаннем дражджэй нізавога браджэння. Лагер доўгі час вытрымліваюць пры тэмпературы 0 градусаў — каб піва асвятлілася і насыцілася вуглекіслым газам. **Ламбік** (бельгійскае піва самаадвольнага браджэння) вырабляецца без удзелу дражджэй, але з дапамогай мікраарганізмаў, якія жывуць у сусле і трапляюць у яго з паветра. **Пшанічнае піва** вырабляюць на падставе пшанічнага соладу і дабраджваюць яго ўжо ў бутэльцы. Падаецца нефільтраваным.

У Расіі, нашай краіне і некаторых іншых прынята класіфікаваць піва па колеры: цёмнае, светлае, чырвонае і белае. Колер піва залежыць ад ступені абсмажання соладу і колькасці цёмнага соладу, які дадаваўся падчас варкі. Поўнасцю безалкагольнага піва не існуе, нават у так званым «безалкагольным» піве — 0,2—1 працэнт спірту. Бытуе меркаванне, што якасць піва можна вызначыць па яго пене. Насамрэч зрабіць гэта можна толькі падчас дэгустацыі. Што ж датычыцца вышыні пены, што быццам бы вызначае якасць напою, то варта мець на ўвазе: такім чынам можна наліць любое піва. Пенная шапка павінна быць стойкай і растварацца не адразу. Гэта можа сведчыць на карысць дадзенага віду напою. Аднак усё роўна самым дакладным спосабам застаецца спроба на смак.

Аматары піва кажуць, што напой той жа расійскай вытворчасці адрозніваецца па смаку ў розных фірмаў. Імпартнае піва, хоць і прыемнае на смак, але мае агульны прысмак. Адбываецца гэта з-за таго, што замежнае піва адразу вырабляецца з улікам доўгага шляху ад вытворцы да пакупніка. Перш за ўсё піва падвяргаецца пастэрызацыі — награванню да тэмпературы 68—72 градусаў для павелічэння тэрміну захоўвання. Далей піва выбраджваюць да пэўнай мяжы, з-за чаго смакавыя вартасці напою значна пагаршаюцца, дый карысныя рэчывы страчваюць сваю сілу. На айчынных і блізказамежных заводах, як сцвярджаецца, своечасова спыняюць працэс браджэння, дзякуючы чаму смак напою застаецца насычаным і яркім. Алкаголь таксама з'яўляецца кансервантам, таму выпушчаныя на Захадзе моцныя гатункі даўжэй захоўваюцца. Так што дзе б вы ні былі, лепей за ўсё ўжываць мясцовае свежае піва. І яшчэ: вытрымлівайце, калі ласка, дозу. Злоўжыванне гэтым быццам бы бяскрыўдным напоем можа прывесці як да сур'ёзных праблем з работай пэўных органаў, так і да піўнога алкагалізму.

**Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.**

# ЁН ТАКІ РОЗНЫ — АРТЫСТ МАНАЕЎ!

**7 жніўня вядомы акцёр-купалавец заслужаны артыст Беларусі Віктар Манаеў адзначае 50-гадовы юбілей.**

У Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы ён працуе з 1980 года. Дзесяткі самых розных роляў на творчым рахунку Віктара Сяргеевіча. Ведаю, што нямала гледачоў ідзе ў тэатр менавіта «на Манаева».

Тэатразнаўцы параўноўваюць яго і з П'ерам Рышарам, і з Чарлі Чаплінам. Але ён — менавіта Манаеў. Адметны своеасаблівым манаеўскім талентам.

Сярод лепшых яго роляў — Хлестакоў («Рэвізор» М. Гогаля), Лёнька Адуванчык («Радавыя» А. Дударава), Гаральд («Гаральд і Мод» К. Хігінса, Ж.К.-Кар'ера), Норман («Касцюмер» Р. Харвуда), Манілаў («Чычыкаў» М. Гогаля), Дзед Жабрак («Сымон-музыка» Якуба Коласа). А ролю Мікіты Зносака ў спектаклі «Тутэйшыя» па аднайменнай п'есе Янкі Купалы ўвогуле можна назваць візітоўкай Віктара Манаева.

І ўсё ж мы верым, што самая лепшая роля Віктара Манаева — яшчэ наперадзе.

Верым і чакаем!

**Таццяна ПАДАЛЯК.**







**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

# Як атрымаць дублікат?




***У сакавіку гэтага года я звольніўся. Спачатку спрабаваў знайсці работу ў Расіі, але не атрымалася, і я вырашыў зноў уладкавацца на работу па месцы свайго жыхарства. Месца працы, дзе мяне згодны ўзяць, я знайшоў, але згубілася працоўная кніжка. Як яе ўзнавіць?***

**Анатоль**, *г. Орша*

Для гэтага вам патрэбна звярнуцца з заявай на апошняе месца працы. Гэта ўстаноўлена пунктам 1.6 пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10.12.1997 г. № 1635 «Аб працоўных кніжках работнікаў» са змяненнямі і дапаўненнямі па стане на 25.03.2008 г.

Згодна з гэтым пунктам, у выпадку страты працоўнай кніжкі (укладыша да яе) работнік мае права звярнуцца да наймальніка па апошнім месцы працы на працягу года з дня яго звальнення. Не пазней за 15 дзён з дня звяртання наймальнік выдае работніку другую працоўную кніжку (укладыш да яе) устаноўленага ўзору 1995 года з надпісам «Дублікат». Пры страце працоўнай кніжкі пасля заканчэння гэтага тэрміну наймальнікам выдаецца даведка аб перыядзе працы ў яго работніка, якая з'яўляецца падставай для завядзення па новым месцы працы такому работніку другой працоўнай кніжкі (укладыша да яе), але з надпісам «Дублікат».

Пры спыненні дзейнасці наймальніка работнік звяртаецца па пытанні выдачы даведкі аб перыядзе працы ў гэтага наймальніка па месцы захоўвання здадзеных ва ўстаноўленым парадку дакументаў строгай справаздачнасці (уласнік ліквідуемага наймальніка, правапераемнік, мясцовы выканаўчы камітэт, архіў і інш.).

У Інструкцыі аб парадку вядзення працоўных кніжак работнікаў, якая зацверджана пастановай Міністэрства працы Рэспублікі Беларусь ад 09.03.1998 г. № 30 са змяненнямі і дапаўненнямі, растлумачваецца, якім чынам павінен запаўняцца дублікат працоўнай кніжкі. Згодна з пунктамі 53—54 Інструкцыі пры запаўненні дубліката ў раздзелах «Звесткі аб рабоце», «Звесткі аб узнагароджаннях», «Звесткі аб заахвочваннях» запісы аб рабоце, узнагароджаннях і заахвочваннях па месцы апошняй працы ўносяцца па агульных правілах на падставе раней выдадзеных загадаў (распараджэнняў).

Калі ж работнік да паступлення да гэтага наймальніка ўжо працаваў, то перш за ўсё пры запаўненні дубліката працоўнай кніжкі ў раздзеле «Звесткі аб рабоце» ў графе 3 ўносіцца запіс аб агульным стажы работы да паступлення да гэтага наймальніка, які пацверджаны дакументамі. Агульны стаж работы запісваецца сумарна, г.зн. указваецца агульная колькасць гадоў, месяцаў, дзён работы і на якіх пасадах ці па якой прафесіі працаваў раней уладальнік працоўнай кніжкі.

Пасля гэтага агульны стаж, пацверджаны належна аформленымі дакументамі, запісваецца па асобных перыядах працы. Калі дакументы не ўтрымліваюць поўнасцю неабходных звестак аб ранейшай рабоце, у дублікат працоўнай кніжкі ўносяцца толькі тыя звесткі, якія маюцца ў дакументах. У графе 4 дубліката працоўнай кніжкі ўказваюцца назва, дата і нумар дакумента, на падставе якога зроблены адпаведныя запісы ў дублікаце. Самі дакументы, якія пацвярджаюць стаж работы, вяртаюцца іх уладальніку.

Наймальнік аказвае садзейнічанне работніку ў атрыманні дакументаў, якія пацвярджаюць стаж яго работы, што папярэднічае паступленню да гэтага наймальніка. Пры страце працоўнай кніжкі (укладыша да яе) па віне наймальніка ён абавязаны самастойна прыняць меры для атрымання гэтых дакументаў.

Крынічка

*«Цякла тут з лесу невялічка*
*Травой заросшая крынічка».*
**Якуб КОЛАС.**

*Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81* **№ 22 (273)**

## Вертыкальны сад з ліян

***(Працяг)***



Спачатку мы пагаворым пра ліяны, якія любяць пагрэцца на сонейку.

Актынідыя каламікта падымаецца на трохметровую вышыню. У час цвіцення яе ўпрыгожваюць стракатыя ружова-белыя лісты, потым яны робяцца зялёнымі. У жніўні выспяваюць смачныя салодкія плады з водарам ананасу. Культура любіць урадлівыя глебы. Часам яе «прыхопліваюць» веснавыя замаразкі: падмярзаюць маладыя парасткі і гінуць кветкі.

Бружмель капрыфоль таксама можа забрацца на трохметровую вышыню, а штогадовы прырост у яго каля 1 м. Кветкі трубчастыя, крэмава-белага колеру, прыемнага водару, цвітуць у маі—чэрвені. У верасні выспяваюць плады аранжавага колеру. Да глебаў расліна непатрабавальная.

Дзявочы вінаград пяцілістковы — магутная ліяна вышынёй да 18 м, штогадовы прырост дае да 2—3 м. У расліны прыгожыя лісты: летам — зялёныя, увосень — пурпуровыя. Дзякуючы непатрабавальнасці і зімастойкасці карыстаецца папулярнасцю ў садаводаў-аматараў, а таксама ў гарадскіх жыхароў.

Вінаград амурскі ў культуры вырастае толькі да 6—7 м. Вызначаецца прыгожымі лістамі вясной — бронзавага колеру, цёмна-зялёнага колеру ўлетку, а ўвосень — жоўтага, аранжавага ці чырвонага. Кветкі дробныя, жаўтаватыя, маюць прыемны пах, раскрываюцца ў маі. Кіслыя ядомыя плады выспяваюць у верасні.

Вінаград прыбярэжны — ліяна з магутным ростам, які ў прыродзе дасягае 20-метровай вышыні, культурныя віды напалову меншыя. Яркія бліскучыя зялёныя лісты і пахучыя кветкі з водарам рэзеды, таму гэты від ліяны называюць яшчэ «рэзедавым вінаградам». Дробныя неядомыя плады пурпурова-чорнага колеру выспяваюць у верасні. На ўрадлівых глебах расце лепш, для сартавых раслін патрэбны рэгулярныя падкормкі і паліў, апрацоўка ад хваробаў і шкоднікаў.

Клематысы набываюць усё большую папулярнасць у садаводаў-аматараў. Некаторыя з іх вызначаюцца буйнымі простымі альбо махровымі кветкамі самай рознай афарбоўкі. Любяць свежыя ўрадлівыя глебы, іх высаджваюць на адлегласці не больш як 80 см ад сцяны. За сезон некалькі разоў падкормліваюць арганічнымі і мінеральнымі ўгнаеннямі, рэгулярна паліваюць і, што важна, трэба засцерагаць ад сонца каранёвую шыйку. Вясной клематысы абразаюць ці ўкарочваюць у залежнасці ад гатунку і тэрмінаў цвіцення.

***(Працяг у наступным выпуску).***

## Часнок з бульбачак

**Пра такую тэхналогію вырошчвання часнаку просіць расказаць чытач з Карэліцкага раёна Мікалай ІВАНОЎ.**

Як вядома, часнок — шматгадовая цыбульная расліна — размнажаецца як вегетатыўна, г. зн. зубкамі, так і паветранымі цыбулінкамі. У формах часнаку са стрэлкамі, акрамя падземных цыбулін, на верхавіне стрэлкі фарміруюцца паветраныя цыбулінкі (бульбачкі), якія выкарыстоўваюцца для пасадкі. У залежнасці ад формы часнаку ў адным суквецці ўтвараецца ад 50 да 150 цыбулінак. Фарміруюцца яны ў чэрвені. Для таго, каб атрымаць буйныя падземныя галоўкі, кветкавыя стрэлкі выломваюць у хуткім часе пасля іх з'яўлення. Менавіта не вырываюць, а абломваюць ці зразаюць наўскасяк, пакідаючы невялікі слупок да 2—3 см.

Трэба памятаць, што часнок, які размнажаецца вегетатыўна, паступова накоплівае вірусную інфекцыю. Таму раз у некалькі гадоў трэба абнаўляць пасадачны матэрыял з дапамогай паветраных бульбачак. Патомства часнаку, вырашчанага з бульбачак, аказваецца больш зімастойкім, устойлівым да непагадзі. Ды і сам гатунак біялагічна амалоджваецца. Такім чынам, стрэлкі пакідаюць на расліне, пакуль паспее бульбачка, г. зн яна павінна раскрыцца сама. Калі абгортка бульбачкі лопаецца, стрэлкі зразаюць і ўкладваюць дасушвацца прыкладна 10—12 дзён. Потым бульбачкі асцярожна абмалочваюць. Цыбулінкі, якія намалацілі з бульбачак, можна высяваць у два тэрміны: увосень і вясной. Да наступнай восені з іх вырастае галоўка часнаку, якая складаецца з аднаго зубка — гэта добры пасадачны матэрыял на наступны сезон. У пачатку кастрычніка (тэрмін пасадкі часнаку) высяваюцца бульбачкі-аднозубкі. На сугліністых глебах глыбіня загортвання 1,5—2,0 см, на лёгкіх пясчаных — 3—4 см. Глебу абавязкова замульчыраваць перагноем або торфам. Цыбуліны размяшчаюць радкамі, адлегласць паміж імі складае 20 см, у радку — 2—4 см. Вясной мульчу зграбаюць з радкоў, а калі глеба падсохне, то яе трэба абавязкова падрыхліць. Догляд такіх пасадак на працягу вясновa-летняга перыяду такі ж, як і часнаку, пасаджанага зубкамі.

## Універсальны лекар



Усе, відаць, памятаюць рэкламны ролік, калі мазь жывакосту (окопника) дапамагла дзядулю пры радыкуліце. Але жывакост — універсальны лекар. Біялагічна актыўныя рэчывы жывакосту валодаюць абвалаквальным і змякчальным дзеяннем, зніжаюць артэрыяльны ціск, нармалізуюць дыханне, павышаюць тонус і ўзмацняюць скарачэнні мускулатуры кішэчніка, садзейнічаюць рэгенерацыі касцявой тканкі. Адвар з 10 г сыравіны на 200 мл вады назначаюць па дэсертнай лыжцы праз кожныя 2 гадзіны пры пераломах касцей і раненнях, гнойных запаленнях тканак. Прымяняюць для паласкання рота пры парадантозе, прыпаркі карысныя пры пераломах, вывіхах, болях у суставах, дыятэзах, розных захворваннях скуры, ранах і язвах.

Цвіце жывакост у маі—чэрвені, выспявае ў ліпені—верасні. Расце на сырых лугах, у лясах, па берагах рэк, азёраў. У жніўні—кастрычніку рэкамендуецца збіраць падземныя лекавыя часткі расліны. Выкапаўшы расліну, адразаюць сцябло, аддзяляюць дробныя карані. Тоўстыя карані трэба разрэзаць уздоўж на кавалкі па 15—20 см і памыць у сцёкавай вадзе. Сушыць карані на гарышчы, пад павецямі альбо ў сушылках пры тэмпературы 30—40 градусаў. Пры павольнай сушцы і дрэннай вентыляцыі белыя ўнутры карані бурэюць і робяцца непрыдатнымі. Гатовая сыравіна — гэта цэльныя ці разрэзаныя ўздоўж карані. Звонку яны чорныя, а калі іх згінаеш, робяцца белыя.

## Сок з вітамінамі

Сок з чарнаплоднай рабіны, каліны і абляпіхі лепш захаваецца, калі пры яго прыгатаванні вы не выкарыстоўвалі металічнага посуду і прылад для яго выціскання. Ягады размінаюцца драўляным таўкачыкам, затым сок выціскаецца ўручную праз марлю ў эмаліраваную пасуду і разліваецца па слоіках. Захоўваецца ў сырым выглядзе ў халадзільніку або склепе некалькі тыдняў. Для больш працяглага захоўвання ў сок можна дабавіць цукар — 1 кг на 1 літр.

## Работы ў садзе ў жніўні

У другой палове лета пладовыя дрэвы, кусты, суніцы закладваюць кветкавыя пупышкі на наступны год — рыхтуецца будучы ўраджай. Важна, каб у гэты час дрэвы не галадалі, не былі аслаблены лішкам ураджаю, не трэба, каб многа сіл аддавалі маладым парасткам.

Падкормкі азотам трэба спыніць. Пакінуць пазакаранёвыя падкормкі суперфасфатам (па лістах). Яны паскараюць выспяванне кветкавых пупышак. Для гэтага 150—200 г суперфасфату настойваюць суткі ў вядры з вадой. Прыствольныя кругі можна паліць растворам мікраэлементаў для найлепшага сілкавання пупышак. У гэты час галоўную каштоўнасць маюць кобальт, малібдэн і бор (на этыкетцы павінны быць ўказаны гэтыя мікраэлементы).

Ва ўмовах кароткага лета кончыкі парасткаў маліны, агрэсту, чорных парэчак ды і яблыні з грушай таксама можна прышчыкнуць для лепшага выспявання.

Прамыя сонечныя промні садзейнічаюць выспяванню парасткаў. Своечасова абразайце секатарам усе непатрэбныя галінкі на пладовых дрэвах. Як мага раней выразайце лішнія зялёныя парасткі ў маліны, каб яны не зацямнялі кусты.

Пустазелле пад дрэвамі і кустамі лепш ператварыць у мульчу. Калі вы не можаце траціць на гэта сілы, накрыйце прыствольныя кругі любым святлонепранікальным матэрыялам. На думку садаводаў, гэта можа быць цёмны лутрасіл: ён лёгкі і даўгавечны.

Загадзя падрыхтуйце месца для восеньскай пасадкі саджанцаў. Напоўніце ўгнаеннямі пасадачныя ямы, правядзіце вапнаванне глебы.

Пры перасадцы буйных саджанцаў з лістамі вельмі важна зменшыць выпарэнне ўкарочаных галінак. Для гэтага на кожную галінку можна надзець празрысты мяшок, завязаўшы яго не знізу, а зверху, інакш галінкі перагрэюцца на сонцы. Гэты прыём павялічвае прыжывальнасць саджанцаў.

Не дазваляйце адрастаць прыкаранёвым парасткам у дрэў: яны развіваюцца за кошт кроны.

## Выспяванне памідораў



Трэба мець на ўвазе, што не апошняй умовай хуткага выспявання памідораў на ўчастку з'яўляецца правільны падбор гатункаў і правільнае іх вырошчванне. У нашых кліматычных умовах трэба аддаць перавагу ранне- і сярэдняспелым гатункам. Расліны таматаў размяшчаюць на сонечных, добра абаграваемых участках. У жніўні збор памідораў ідзе поўным ходам. Збіраць іх трэба два разы на тыдзень. У халаднаватае і дажджлівае лета ў цяпліцах, таксама ў адкрытым грунце застаецца многа недаспелых пладоў, таму ўсе намаганні павінны быць накіраваны на тое, каб плады хутчэй выспявалі. Для гэтага, рэкамендуюць практыкі, прышчыкніце ўсе пункты росту, выдаліце пасынкі, абарвіце кветкі, якія не распусціліся, выдаліце лішнюю завязь. Паступова, раз на тыдзень, абломвайце па 2—3 ніжнія лісты расліны. Звычайна гэтыя лісты зацэнены, маюць бляклa-зялёную або нават жоўтую афарбоўку. Зняўшы іх, вы ўзмоцніце доступ святла да астатняй часткі расліны. Каб паскорыць выспяванне пладоў, бывалыя агароднікі паварочваюць кісці памідораў да сонца ці абмяжоўваюць паступленне ў расліны пажыўных рэчываў і вільгаці, накіроўваючы ўсе рэсурсы расліны на плады. Многія гаспадары для паскарэння выспявання памідораў прымяняюць поліэтыленавыя мяшкі. Іх накідваюць на кісці і ў ніжняй частцы мяшка робяць адтуліну, каб сцякаў кандэнсат. Поліэтыленавыя мяшкі ахоўваюць плады ад фітафтарозу, і ў іх больш высокая тэмпература. Трэба мець на ўвазе і тое, што даводзіць плады да поўнай спеласці непажадана, іх трэба збіраць бурымі. Гэты нескладаны прыём дае магчымасць выспяваць зялёным памідорам, што засталіся на кусце. Уборка пладоў не ў поўнай спеласці выключае іх захворванне на фітафтору, якая настолькі небяспечная ў жніўні.

Са зборам памідораў спазняцца нельга, асабліва калі вы іх збіраецеся доўга захоўваць. Плады трэба зняць з куста, пакуль тэмпература паветра не апусціцца ўначы ніжэй за плюс 6 градусаў. Калі ж плады на кустах трапілі пад тэмпературу ніжэйшую за ўзгаданую, то іх трэба неадкладна зняць з куста і прагрэць 2 хвіліны ў вадзе з тэмпературай 60 градусаў. Гэта выратуе іх ад псавання ў час захоўвання.

## Сакрэты дачнага вопыту

Звычайна агароднікі цяпліцу адчыняюць удзень і зачыняюць на ноч. Такім чынам, пры начным зніжэнні тэмпературы і адсутнасці эфектыўнай вентыляцыі ствараюцца ўмовы для выпадзення расы на лісцях раслін, нават на кончыках звісаюць яе кропелькі. А фітафторы толькі гэта і трэба. Паспрабуйце зрабіць усё наадварот: на ноч усе форткі і фрамугі адкрыць, забяспечваючы максімальнае праветрыванне. Сухое зніжэнне тэмпературы ўначы не пашкодзіць раслінам. У час цвіцення пры дапамозе фортак і фрамуг падтрымлівайце ў цяпліцы тэмпературу 20—25 градусаў. У перыяд росту пладоў і іх выспявання форткі і фрамугі закрывайце, каб тэмпература трымалася на ўзроўні 30—35 градусаў. Пры такім рэжыме плады таматаў хутчэй выспяваюць, а таксама набіраюць масу.

Дзве даты

## 7 жніўня

**1910 год** — нарадзіўся Генадзь Цітовіч, славуты беларускі дырыжор, музыказнаўца-фалькларыст, народны артыст Беларусі і СССР. Вёў вялікую работу па збіранні і вывучэнні музычнага фальклору. У розных раёнах Беларусі запісаў каля 3 тысяч народных мелодый, адлюстраваў у складзеных ім зборніках разнастайнасць песенных жанраў. Вялікую ўвагу надаваў міжславянскім фальклорным сувязям, музычнаму побыту беларускай вёскі. Стваральнік і мастацкі кіраўнік на працягу больш як 20 гадоў Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь, які зараз носіць яго імя.



**1932 год** — у Савецкім Саюзе прыняты закон «аб трох каласках», згодна з якім крадзеж калгаснай маёмасці караўся смерцю.

Цытата дня

*«Майстэрства пісаць папярэднічае майстэрству мысліць».*

**Ален (1868—1951), французскі літаратурны крытык.**

## Усміхнёмся!

**У дзесятым класе школы задаюць сачыненне на тэму «Што б я зрабіў, калі б стаў прэм'ер-міністрам». Усе 30 чалавек з класа напісалі розныя гісторыі, але ўсе яны заканчваліся адной фразай: «І трасцу б вы мяне тады знайшлі!»**

☺

У Адэсе на вакзале ўздоўж перона ідзе мужык і манатонна бубніць:

— Газеты, часопісы, эротыка, гараскопы, анекдоты...

Пакупнік працягвае купюру:

— Анекдоты, калі ласка.

Мужык глядзіць грошы на святло, хавае купюру ў шырокія вайсковыя галіфэ і:

— Значыць так, слухай сюды — вяртаецца мужык з камандзіроўкі...




**ОАО «Минский приборостроительный завод»**

**повторно проводит открытый аукцион по продаже объекта недвижимости, расположенного в г. Минске, по ул. Академика А.К. Красина, 201**

Часть 3-этажного административно-производственного здания № 10 (незавершенное строительство) с подвалом в осях «5-15; А-Г» площадью 3 063,8 кв. м и часть технологического зала в осях «Г-И; 5-13» в пределах вертикальных отметок «+8,4; 21,0» площадью 1 147,2 кв. м (общая площадь 4 211 кв. м) по ул. Академика А.К. Красина, 201.

Начальная цена продажи составляет: 1 195 354 125 рублей РБ с учетом НДС (18 %).

Задаток в размере 5 % от начальной цены продажи перечисляется на расчетный счет УП «Завод Радиан» ОАО «Минский приборостроительный завод» № 3012013610018 в филиале ОАО «БПС-Банк» г. Минск, код 334, УНН 808000209.

Порядок проведения торгов оговорен в условиях аукциона.

**Аукцион состоится 14 августа 2008 года в 10.00 по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 58.** Заявления и необходимые документы принимаются до 16.30 13 августа 2008 г. по адресу: г. Минск, ул. Академика А.К. Красина, 201.

**Справки по телефонам: 209 43 29; 299 44 10.**



У будаўніцтве мемарыяла ў Чырвоным Беразе прымаў непасрэдны ўдзел калектыў трэста.

# У КАЛЕКТЫВУ ТРЭСТА № 40 РАБОТА ЗВЫЧАЙНАЯ: БУДАВАЦЬ НАДЗЕЙНА



Намеснік упраўляючага трэста Аляксандр ЛЯГЧАК і прараб Васіль ІГНАЦЮК робяць зверку праектнай дакументацыі.



Вось такія дамы будуе калектыў трэста.

**Мінулым летам да Дня Незалежнасці рэспублікі ў населеным пункце Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна ва ўрачыстай абстаноўцы быў адкрыты мемарыял у памяць аб дзецях, якія сталі ахвярамі Вялікай Айчыннай вайны і катастрофы на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Без горкага смутку і журбы, без цяжкага настрою, наведаўшы яго, не застаецца ніводзін чалавек. Задумаў праект з творчай групай заслужаны архітэктар Беларусі лаўрэат Ленінскай прэміі Леанід Левін, а ўзводзіў — калектыў адкрытага акцыянернага таварыства «Будаўніча-мантажны трэст № 40», які ўзначальвае Юрый Казлоў.**

Прысутнічаючы на той цырымоніі адкрыцця мемарыяла, які назвалі дзіцячай Хатынню, мы лавілі сябе на думцы аб тым, колькі старання, колькі творчасці трэба было праявіць, каб вось так, да болю выразна, засведчыць у цэгле, метале і бетоне трагедыю 1990 хлопчыкаў і дзяўчатак, чые мары засталіся нязздзейсненымі, растаптанымі фашысцкім ботам. Ідэя ўвасобленая і ў бронзавай фігурцы схуднелай і змарнелай дзяўчынкі-падлетка, і ў яе пісьме на чорнай дошцы з пекла-палону свайму бацьку, якога просіць адпомсціць ворагу, і ў так званым мёртвым класе з пятнаццаццю пустымі белымі партамі (столькі дзяцей з Чырвонага Берага было вывезена ў Германію, каб яны, як донары, сваёю крывёю надавалі сіл і моцы параненым салдатам і афіцэрам вермахта), і ў белым Караблiку-ветразі з прозвішчамі і імёнамі закатаваных зняволеных дзяцей, і ў многіх іншых элементах мемарыяла-будоўлі.

— Дзіцячая Хатынь — адзін з аб'ектаў, які было даручана ўзводзіць нам, — расказвае Юрый Кірылавіч. — Не сорамна за яго. Душу ў яго ўклалі.

Ды ці толькі адзін ён такі? У гэтым пераконваешся, калі пабываеш у Жлобіне, адначасова старажытным і маладым горадзе на Дняпры, пройдзеш па яго вуліцах, загледзішся на гмахі будынкаў. Многія, вельмі многія з іх выйшлі з-пад старанных і ўмелых рук будаўнікоў саракавога трэста. Ды і зараз выходзяць.



32 гады аддаў будаўнічай галіне Васіль ЛОМЦІК.

Вось, напрыклад, прыехалі мы з намеснікам упраўляючага Аляксандрам Легчаком у васемнаццаты мікрараён, дзе вясёлымі фарбамі фасада нібы зіхаціць, радуецца з'яўленню на свет дзевяціпавярховік-прыгажун. Ён толькі што здадзены ў эксплуатацыю і чакае 71 сям'ю, большасць якіх шматдзетныя. Хутка будуць уваходзіны ў ім, і вядома, адзначаючы іх, успомняць людзі добрым словам будаўнікоў.

Падыходзіць прараб Васіль Ігнацюк і гаворыць, што дом узведзены на сродкі членаў КІЗа, а да яго вунь прыбудоўваецца такі ж самы. На 71 кватэру. Тры паверхі ўжо выгнаны ў цагляным выкананні. Узяліся за чацвёрты. Вось у гэтую змену працуе брыгада муляраў Пятра Мазгова, а дакладней, частка яе, бо іншыя на чале з яе кіраўніком былі занятыя тут у начную змену. Задзейнічаны таксама і брыгады Міхаіла Косікава і Сяргея Батманава. Унізе шчыруюць работнікі ўпраўлення механізацыі будаўнічых работ, ідзе комплекс работ па добраўпарадкаванні тэрыторыі, а ўнутры дзевяціпавярховіка — аддзелачнікі спецыялізаванага ўпраўлення № 252. Усяго шэсцьдзесят чалавек.

Чаму працуюць у тры змены, перапытваю ў Васіля Юліянавіча. У чацвёртым квартале намечана здаць дом, адказаў ён. Зусім побач ужо ідуць падрыхтоўчыя работы для будаўніцтва яшчэ аднаго дзевяціпавярховіка для КІЗа. У прыватнасці, пачата перабазіроўка вежавага крана, а пройдзе нейкі час — на аб'екце з'явяцца муляры. Дарэчы, там, на чацвёртым паверсе, мы гутарылі з імі. Вопытнымі, з вялікім стажам работы, і маладымі, якія толькі пачынаюць сваю працоўную біяграфію.

Вось Анатоль Маскаленка, муляр і цясляр-бетоншчык. Васіль Ломцік такой жа прафесіі. Першы аддаў будаўнічай галіне 27 гадоў, другі — 32 гады. Васіль Міхайлавіч раіў свайму сыну Аляксандру стаць будаўніком. Той паслухаў. А вось Яўген Котаў і Павел Глебка на будоўлю прыйшлі крыху больш як месяц назад. Першы навучаецца пад кіраўніцтвам брыгадзіра, другі ж пасля Рагачоўскага будаўнічага каледжа № 100 удасканальвае рабочыя навыкі пасля атрымання тэарэтычных ведаў. Дарэчы, вытворчую практыку ён праходзіў у трэсце. Тое ж самае і ў Тацццяны Кір'янавай, якая свой лёс звязала з будаўніцтвам (яна — аддзелачніца, тынкоўшчык-маляр) трыццаць гадоў назад, і ў Святланы Кісялёвай, у якой працоўны стаж будаўніка ў дзесяць разоў меншы, чым у яе старэйшай сяброўкі. Адным словам, сплаў вопыту і маладосці.



Маляры-тынкоўшчыкі Тацццяна КІР'ЯНАВА і Святлана КІСЯЛЁВА.



Сплаў вопыту і маладосці: муляры Анатоль МАСКАЛЕНКА, Яўген КОТАЎ і Павел ГЛЕБКА.

**ААТ «Будаўніча-мантажны трэст № 40»**
**247210 г. Жлобін,**
**вул. Барташова, 1**
**Тэл./факс (02334) 2 05 50**



Перадавая брыгада аддзелачнікаў Святланы БУШУЕВАЙ.

### Увод жылля за першае паўгоддзе — 6394 квадратныя метры

**У тым ліку:**
шэсць аднакватэрных дамоў у населеным пункце Стрэшын — 440 м²
пяць аднакватэрных дамоў у н.п. Малевічы — 366 м²
тры аднакватэрныя дамы ў н.п. Рэкта — 220 м²
рэканструкцыя двухпавярховага блока абслугоўвання з надбудовай трэцяга паверха пад жылы дом для маласямейных па вуліцы Ленінградскай у Жлобіне — 616 м²
кааператыў індывідуальных забудоўшчыкаў (КІЗ) «Мара-2006» — 4752 м²

## Вышыні трэста

Гэта арганізацыя была створана ў **1981 годзе** на базе будаўнічых упраўленняў № 162 і № 223 (трэст № 20) і № 132 (трэст № 27), упраўлення вытворча-тэхнічнай камплектацыі, участка механізацыі і жыллёва-эксплуатацыйнага ўчастка. У 1996 годзе прадпрыемства стала адкрытым акцыянерным таварыствам. Асноўным прадметам яго дзейнасці з'яўляецца будаўніцтва аб'ектаў сацыяльнага, культурнага і бытавога прызначэння, вытворчых і невытворчых магутнасцяў, жыллёвага будаўніцтва. Для якаснага выканання будаўніча-мантажных работ прадпрыемства аснашчана ўсімі неабходнымі механізмамі і будаўнічай тэхнікай, падсобнай вытворчасцю, мае кваліфікаваную рабочую сілу. Яго калектыў можа выконваць будаўнічыя работы любой ступені складанасці.

**За час сваёй дзейнасці ён пабудаваў і ўвёў у дзеянне многія аб'екты:**
- унутрыпляцовачныя інжынерныя сеткі і збудаванні для Беларускага металургічнага завода;
- комплекс збудаванняў водазабору тэхнічнай вады;
- комплекс збудаванняў і водазабору пітной вады і збудаванняў другога водазабору «Лебядзёўскі»;
- дзесяткі пасёлкаў (больш як паўтары тысячы домікаў) для жыхароў, што пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай атамнай станцыі;
- комплекс збудаванняў радыётэлевізійнай станцыі;
- комплекс збудаванняў Жлобінскага тэрытарыяльнага медыцынскага аб'яднання (хірургічны комплекс, дзіцячае аддзяленне, радзільны дом, дзіцячая паліклініка і г.д.);
- школы, дзіцячыя сады;
- жылыя дамы;
- металургічны тэхнікум;
- рынaчны павільён;
- комплекс будынкаў Дзіцячага рэабілітацыйнага цэнтра «Пралеска»;
- піянерскі лагер «Вясёлка»;
- Палац культуры металургаў;
- друкарня;
- фабрыка штучнага футра і мясакамбінат;
- вытворчыя базы «Энерганагляду» і «Гаргазу»;
- выратавальная станцыя;
- шэраг магазінаў;
- аўтазаправачныя станцы ў гарадах Жлобіне і Рагачове;
- домікі на вёсцы згодна з Прэзідэнцкай праграмай адраджэння сяла і развіцця вёскі.

Мы пабывалі з Аляксандрам Яўгенавічам толькі на адным аб'екце, і ён распавёў, што калектыў трэста, у якім 695 чалавек, заняты сёння і на будаўніцтве дамоў для вяскоўцаў, вальцапракатнага цэха Беларускага металургічнага завода, дзе работы на гэтым важным аб'екце трэба закончыць у сёлетнім чацвёртым квартале, і на рэканструкцыі Акадэмічнага тэатра оперы і балета ў Мінску, які знаходзіцца на кантролі ў Прэзідэнта краіны. Дарэчы, брыгада аддзелачнікаў Святланы Бушуевай на рэспубліканскім конкурсе, які праходзіў на ўказаным аб'екце, заняла другое месца.

Калі гаварыць аб тэхнічнай аснашчанасці калектыву, дык апошнім часам яна значна палепшылася, што ў пэўнай ступені аблягчае працу людзей, дазваляе дабівацца большай эфектыўнасці вытворчасці. Набыткамі яго сталі вежавы кран, чатыры аўтамабільныя краны, пяць бетонамяшалак, грэйдар і г.д. Мадэрнізацыя патрабавала ўкласці ў яе звыш двух мільярдаў рублёў. Шкада толькі, што не хапае грашовых сродкаў для набыцця бытавых гарадкоў, якія каштуюць вельмі дорага. Апошні быў куплены гадоў дзесяць назад. Ды нічога, пакуль абыходзяцца з гэтым у трэсце наступным чынам. Бытавыя памяшканні перавозяцца на базу трэста, мадэрнізуюцца належным чынам і зноў займаюць сваё месца на аб'ектах.

А што з кадрамі, ці ёсць цякучасць іх? Па кадрах асаблівага голаду няма, цякучасць невялікая, аднак хацелася б, каб кваліфікацыя рабочых была вышэйшай. Не сакрэт, што многія вопытныя будаўнікі (і гэта праблема ўсёй краіны) ездзяць на заробкі ў рэгіёны Расійскай Федэрацыі, дзе яны атрымліваюць куды большыя грошы. У трэсце ў сярэднім заработная плата складае 790 тысяч рублёў, і калі раней ён меў для падрыхтоўкі кадраў свой вучэбны пункт, дык сёння навучанне і павышэнне кваліфікацыі праходзіць у Жлобінскім філіяле «Гомельвучцэнтрбуда».

А за гэта трэба плаціць. Тым не менш у трэсце не адзінкі будаўнікоў, у якіх вялікі працоўны стаж і якія з'яўляюцца майстрамі сваёй справы, аб чым было ўжо сказана вышэй. Кіраўнік яго Юрый Казлоў быў накіраваны на работу сюды з Гомеля аблвыканкамам у 1981-м, годзе стварэння арганізацыі, на пасаду начальніка вытворча-тэхнічнага аддзела. Потым узначальваў будаўнічыя ўпраўленні № 162 і № 132, а дваццаць гадоў назад на альтэрнатыўнай аснове быў абраны кіраўніком трэста. Дарэчы, і Аляксандр Лягчак ва ўказанай арганізацыі з 1981 года, а на пасадзе намесніка ўпраўляючага па ідэалогіі, кадрах і побыце больш як пятнаццаць гадоў.

Абодва ў свой час актыўна займаліся спортам, абаранялі гонар вобласці і рэспублікі на спаборніцтвах па валейболе, таму і дбаюць аб развіцці фізкультуры і спорту ў калектыве, які на апошняй галіновай абласной спартакіядзе з пяці відаў спорту ў двух стаў першым і ў трох — другім. Агульнакаманднае месца — першае. Спартыўна-аздараўленчы комплекс трэста — самы вялікі ў Жлобіне. 36 на 21 метр. Культывуюцца валейбол, баскетбол, міні-футбол, вялікі тэніс. Маецца саўна з плавальным басейнам, праўда, невялікім. На балансе ў прадпрыемства шэсць інтэрнатаў для маласямейных, утрыманне якіх ажыццяўляецца за кошт уласнага прыбытку трэста, кампенсацыя ж дзяржавы нязначная, і гэта стварае пэўныя цяжкасці.

У пятніцу калектыў трэста збярэцца на ўрачысты сход, прысвечаны Дню будаўніка. Будуць віншаванні, матэрыяльныя і маральныя заахвочванні лепшых працаўнікоў. Будзе свята, з якім і мы віншуем калектыў, жадаем кожнаму добрага здароўя, светлага настрою, сямейнага шчасця.

**Матэрыял падрыхтаваў Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**
**Фота Івана ЧЭКАНА.**
**УНП 400076022**

**Калектыў ААТ «Будаўніча-мантажны трэст № 40» прымаў удзел у ліквідацыі вынікаў землетрасення ў горадзе Спітаку (Арменія), узводзіў аб'екты сацыяльнага прызначэння ў горадзе Лангепасе (Расійская Федэрацыя), у Маскве — прадстаўніцтва Інгушэціі, катэджы ў Падмаскоўі і Смаленскай вобласці і г.д.**

### Вынікі работы за студзень—чэрвень 2008 года

| № п/п | Паказчыкі | Адзінка вымярэння | Студзень—чэрвень 2008 г. | Студзень—чэрвень 2007 г. | Працэнт выканання да адпаведнага перыяду |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Аб'ём будаўніча-мантажных работ уласнымі сіламі<br>— у бягучых цэнах<br>— у цэнах 1991 г.<br>— у супастаўных цэнах | <br><br>млн руб.<br>тыс. руб.<br>млн руб. | <br><br>13801<br>6261<br>11947 | <br><br>10711<br>5103<br>10711 | <br><br>128,8<br>122,7<br>111,5 |
| 2 | Прадукцыйнасць працы<br>— у бягучых цэнах<br>— у цэнах 1991 г.<br>— у супастаўных цэнах | <br>тыс. руб.<br>руб.<br>тыс. руб. | <br>21598<br>9799<br>18697 | <br>16530<br>7875<br>16530 | <br>130,7<br>124,4<br>113,1 |
| 3 | Тэмп росту прадукцыйнасці працы ў супастаўных цэнах | % | 113,1 | | |
| 4 | Прыбытак ад рэалізацыі будаўніча-мантажных работ | млн руб. | 565 | 93 | у 6,1 раза |
| | Чысты прыбытак | млн руб. | 124 | 6 | у 20,7 раза |
| 5 | Узровень рэнтабельнасці ад рэалізацыі будаўніча-мантажных работ | % | 3,3 | 0,7 | у 4,7 раза |
| 6 | Сярэднямесячная зарплата з пачатку года | тыс. руб. | 790,3 | 662,5 | 119,3 |
| 7 | Рост рэальнай зарплаты | % | 106,2 | | |
| 8 | Сярэдняспіскавая колькасць, у тым ліку на будаўніча-мантажных работах | чалавек | 695<br>639 | 706<br>648 | |
| 9 | Паказчык па энергазберажэнні | % | -9,5 | -7,8 | 121,8 |
| 10 | Увод жыллёвага фонду | м² | 6394 | 1586 | 403,2 |
| 11 | Выручка ад рэалізацыі работ | млн руб. | 19789 | 15857 | 124,8 |

## ПЕРШЫ Ў БЕЛАРУСІ МУЗЕЙ АКУШЭРСТВА

**У Гродзенскім абласным клінічным перынатальным цэнтры ўрачыста адчынены першы ў краіне музей развіцця акушэрства. Ён знаёміць з гісторыяй акушэрскай справы на нашых землях, пачынаючы ад павітух і заканчваючы сучаснымі медыцынскімі тэхналогіямі.**

Музейная калекцыя, якая стваралася пры дапамозе Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, налічвае больш за тысячу арыгінальных экспанатаў і каля 500 фатаграфій. «І гэта толькі пачатак, — адзначае галоўны ўрач цэнтра Віктар Лісковіч, — калекцыя будзе папаўняцца».

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**


# РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «КОРОЛЕВСКИЕ СОКРОВИЩА»

В период **с 30 мая 2008 года по 01 августа 2008 года** (включительно) в казино «Royal» по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 11, корп. 1 проводилась рекламная игра «Королевские сокровища».

**Игра проводилась в составе комиссии рекламной игры «Королевские сокровища»:**
- Магеров Сергей Федорович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — начальник смены)

Члены комиссии:
- Лесков Сергей Александрович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — начальник смены)
- Умецкий Станислав Александрович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — заместитель начальника смены)

Призовой фонд игры в размере **115 560 000** (сто пятнадцать миллионов пятьсот шестьдесят тысяч) белорусских рублей, в том числе сумма «Джек Пота» — 57 780 000 (пятьдесят семь миллионов семьсот восемьдесят тысяч) белорусских рублей, разыгран полностью, между следующими участниками:

В **1-ом этапе** розыгрыша, который проводился 02 июня 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 1 этапа рекламной игры, получил — Ладутько Андрей Владимирович;

Во **2-ом этапе** розыгрыша, который проводился 04 июня 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 2 этапа рекламной игры, получил — Шестакович Николай Михайлович;

В **3-ем этапе** розыгрыша, который проводился 06 июня 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 3 этапа рекламной игры, получил — Ладутько Андрей Владимирович;

В **4-ом этапе** розыгрыша, который проводился 09 июня 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 4 этапа рекламной игры, получил — Шестакович Николай Михайлович;

В **5-ом этапе** розыгрыша, который проводился 11 июня 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 5 этапа рекламной игры, получил — Конон Михаил Ростиславович;

В **6-ом этапе** розыгрыша, который проводился 13 июня 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 6 этапа рекламной игры, получила — Шестакович Наталья Владимировна;

В **7-ом этапе** розыгрыша, который проводился 16 июня 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 7 этапа рекламной игры, получил — Науменко Анатолий Григорьевич;

В **8-ом этапе** розыгрыша, который проводился 18 июня 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 8 этапа рекламной игры, получил — Науменко Анатолий Григорьевич;

В **9-ом этапе** розыгрыша, который проводился 20 июня 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 9 этапа рекламной игры, получил — Шестакович Николай Михайлович;

В **10-ом этапе** розыгрыша, который проводился 23 июня 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 10 этапа рекламной игры, получила — Шестакович Наталья Владимировна;

В **11-ом этапе** розыгрыша, который проводился 25 июня 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 11 этапа рекламной игры, получил — Науменко Анатолий Григорьевич;

В **12-ом этапе** розыгрыша, который проводился 27 июня 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 12 этапа рекламной игры, получил — Шестакович Николай Михайлович;

В **13-ом этапе** розыгрыша, который проводился 30 июня 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 13 этапа рекламной игры, получил — Козел Сергей Михайлович;

В **14-ом этапе** розыгрыша, который проводился 02 июля 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 14 этапа рекламной игры, получила — Шестакович Наталья Владимировна;

В **15-ом этапе** розыгрыша, который проводился 04 июля 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 15 этапа рекламной игры, получил — Косенюк Виталий Васильевич;

В **16-ом этапе** розыгрыша, который проводился 07 июля 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 16 этапа рекламной игры, получил — Косенюк Виталий Васильевич;

В **17-ом этапе** розыгрыша, который проводился 09 июля 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 17 этапа рекламной игры, получила — Шестакович Наталья Владимировна;

В **18-ом этапе** розыгрыша, который проводился 11 июля 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 18 этапа рекламной игры, получил — Косенюк Виталий Васильевич;

В **19-ом этапе** розыгрыша, который проводился 14 июля 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 19 этапа рекламной игры, получил — Науменко Анатолий Григорьевич;

В **20-ом этапе** розыгрыша, который проводился 16 июля 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 20 этапа рекламной игры, получил — Крискевич Николай Федорович;

В **21-ом этапе** розыгрыша, который проводился 18 июля 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 21 этапа рекламной игры, получил — Кунец Сергей Владимирович;

В **22-ом этапе** розыгрыша, который проводился 21 июля 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 22 этапа рекламной игры, получил — Шестакович Николай Михайлович;

В **23-ом этапе** розыгрыша, который проводился 23 июля 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 23 этапа рекламной игры, получил — Кунец Сергей Владимирович;

В **24-ом этапе** розыгрыша, который проводился 25 июля 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 24 этапа рекламной игры, получил — Кунец Сергей Владимирович;

В **25-ом этапе** розыгрыша, который проводился 28 июля 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 25 этапа рекламной игры, получил — Баранов Руслан Васильевич;

В **26-ом этапе** розыгрыша, который проводился 30 июля 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 26 этапа рекламной игры, получил — Баранов Руслан Васильевич;

В **27-ом этапе** розыгрыша, который проводился 01 августа 2008 года, денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 27 этапа рекламной игры, получил — Кунец Сергей Владимирович.

**Сумма «Джек Пота» в размере 57 780 000 (пятьдесят семь миллионов семьсот восемьдесят тысяч) белорусских рублей** была разыграна 01 августа 2008 года, и ее обладателем стал — Кунец Сергей Владимирович.

С момента получения приза, а также любого иного дохода в рамках Игры, вышеназванные Участники несут ответственность за уплату всех применимых налогов, установленных действующим законодательством Республики Беларусь.

*Свидетельство о государственной регистрации правил проведения рекламной игры выдано Министерством торговли Республики Беларусь за № 968 от 04 марта 2008 года. УНП 190617507*


## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.34 | 20.55 | 15.21 |
| Віцебск — | 5.19 | 20.50 | 15.31 |
| Магілёў — | 5.24 | 20.46 | 15.22 |
| Гомель — | 5.27 | 20.36 | 15.09 |
| Гродна — | 5.50 | 21.10 | 15.20 |
| Брэст — | 5.56 | 21.05 | 15.09 |

**Месяц**
*Першая квадра. Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

**Імяніны**
*Пр. Алімпіяды, Ганны, Іраіды, Аляксандра, Макара.*
*К. Дароты, Клаўдзіі, Кандрата, Каятана, Сікста.*




Паважанага **Адама МАЛЬДЗІСА,** нястомнага даследчыка-пісьменніка, віншую з днём народзінаў. Здароўя!
**Алесь Жалкоўскі, г. Ліда.**

Сардэчна віншуем з юбілеем **Валянціну Мікалаеўну ДАВІДОВІЧ (Сокал)** з Мінска.
Жадаем радасці ад жыцця, добразычлівасці ад усіх, хто вас акружае, моцнага здароўя на доўгія гады.
**Родныя і блізкія.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

**Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.**
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».**
**Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.**
**Тыраж 33.948 Індэкс 63850. Зак. № 4249. Нумар падпісаны ў 19.30.**
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12